Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (100), 2017

*УДК 94(476)*

# Станаўленне рынкавых інстытутаў і рэфармаванне эканомікі Беларусі ў 1991–1994 гг.

П.А. Жылінскі

На падставе шырокага кола архіўных крыніц, матэрыялаў перыядычнага друку, дадзеных афіцынай статыстыкі ў артыкуле разглядаюцца працэсы станаўлення рынкавых інстытутаў у Беларусі на працягу першай паловы 1990-х гг. Аўтар асвятляе працэс стварэння рынкавай інфраструктуры, якая ўключала ў сябе мерапрыемствы па фарміраванні рынку капітала, сродкаў вытворчасці, іншых важных элементаў новай эканамічнай мадэлі. У выніку даследавання ўстаноўлена, што гэтыя працэсы насілі супярэчлівы характар. З аднаго боку стваралася неабходная інфраструктура, удасканальвалася нарматыўна-прававая база. Разам з тым працэсы рэфармавання рухаліся павольна, пераўтварэнні нярэдка насілі палавіністы і не зусім паслядоўны характар, беларуская эканоміка паранейшаму захоўвала шмат рысаў, уласцівых для савецкай адміністрацыйна-каманднай сістэмы.
**Ключавыя словы:** рынкавая эканоміка, банкі, рынак каштоўных папер, гандаль, эканамічная трансфармацыя, Рэспубліка Беларусь, рэформы, 1990-ыя гг., навейшая гісторыя Беларусі, эканамічнае развіццё Беларусі.

The processes of market institutions development in Belarus during the first half of the 1990s are analyzed on the basis of a wide range of archival sources, periodical press materials, official statistics the article examines. The process of creating the market infrastructure which included measures for the capital market formation, the means of production, other important elements of the new economic model are considered. As a result of the study an ambivalent character of these processes was determined. On the one hand, they created the necessary infrastructure, vividly improved the existing legal framework. Alongside with this, the reform processes were implemented very slowly, they were often limited to half-way, inconsistent measures and the Belarusian economy still retained many features peculiar to the Soviet administrative-command system.
**Keywords:** market economy, banks, stock market, trade, economic transformation, Republic of Belarus, reforms of the 1990s, newest history of Belarus, economic development of Belarus.

Пераходная эканоміка ўяўляе сабой працэс трансфармацыі адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў рынкавую. Падчас яе не толькі змяняецца эканамічная палітыка і метады гаспадарання, а адбываецца пераўтварэнне ўсёй сацыяльна-эканамічнай сістэмы. У выніку новымі становяцца адносіны ўласнасці, сувязі вытворчасці і спажывання, мэты і сродкі эканамічнага развіцця. Ключавую ролю ў трансфармацыйных пераўтварэннях мае працэс стварэння рынкавай інфраструктуры, якая ўяўляе сабой сукупнасць інстытутаў, якія забяспечваюць неабходныя ўмовы для функцыянавання рынкавых адносін. Рынкавая інфраструктура ўключае ў сябе рынак капітала, сродкаў вытворчасці, працы і іншыя важныя складанікі, якія дазваляюць функцыянаваць рынкавай эканоміцы. Нягледзячы на першыя спробы яшчэ ў савецкія часы «пасадзіць» рынкавыя адносіны на беларускую глебу, менавіта ў першай палове 1990-х гг. фарміруюцца асноўныя, найбольш важныя элементы новай эканамічнай мадэлі.

Адным з першых крокаў на шляху да рэфармавання эканомікі ва ўмовах незалежнасці стала палітыка па лібералізацыі цэн. Яшчэ ў канцы 1990 г. быў арганізаваны продаж асобных тавараў па камерцыйных цэнах [1, с. 53], але шырокамаштабная лібералізацыя пачалася толькі з 1 студзеня 1992 г.

У канцы 1991 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў дзве пастановы, якія тычыліся дзяржаўнай цэнавай палітыкі. Згодна з пастановай ад 28.12.1991 № 495, адпускаліся рознічныя цэны. Пры гэтым яны заставаліся фіксаванымі на хлеб і хлебабулачныя вырабы. Таксама за кошт датацый з бюджэту рэгуляваліся цэны на мясныя і малочныя прадукты, цукар, дзіцячыя тавары, медыкаменты, жыллёва-камунальныя паслугі, транспартныя перавозкі. Дзяржэканомплану рэспублікі было нададзена права пры неабходнасці ажыццяўляць рэгуляванне коштаў, уносіць змены ў пералік тавараў і паслуг па фіксаваных цэнах і тарыфах. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №497 ад 28.12.1991 з сакавіка 1992 г. уводзіліся свабодныя аптовыя цэны і тарыфы на прадукцыю (работы, паслугі) вытворча-тэхнічнага прызначэння.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Трэба адзначыць, што ў шэрагу з тым, што захаванне фіксаваных цэн на тавары першай неабходнасці здымала сацыяльнае напружанне, нярынкавае цэнаўтварэнне стварала праблемы, якія назіраліся ў познасавецкія часы – спекуляцыя і нямэтавае ўжыванне. Кантроль за цэнамі на хлеб прывёў да выкарыстання яго на корм скаціне і вывазу ў Прыбалтыку [2, арк. 234–235]. Падобная сітуацыя склалася з іншымі групамі тавараў, цэны на якія рэгуляваліся. У выніку павялічвалася сярэднедушавое ўжыванне прадуктаў харчавання, што вяло да росту датацый на іх вытворчасць. Дзяржава марнавала вялікія грошы на пакрыццё розніцы паміж стратамі на выраб гэтых тавараў і ўсталяваную адміністрацыйным шляхам цану. У першым квартале 1994 г. датацыі розніцы ў цэнах на харчовыя тавары склалі 420,8 млрд. рублёў, пры тым што ў бюджэце рэспублікі на год было запланавана толькі 190,3 млрд. [3, арк. 14].

Выразнай выяўлялася бесперспектыўнасць палітыкі стрымлівання цэнаў, адміністрацыйнае рэгуляванне якіх існавала і ў іншых сферах эканомікі. Паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў 1991–1994 гг. датаваліся больш чым на 90 % [3, арк. 16]. Ільготы існавалі для арганізацый адукацыі і аховы здароўя, насельніцтва. Найбольш значныя страты бюджэт нёс ў выніку падтрымкі аграпрамысловага комплексу, дзе тарыф на электраэнергію з савецкіх часоў захоўваўся на ўзроўні 8 капеек за кілават-гадзіну [4, арк. 20–21].

Трэба адзначыць, што ўлады знаходзіліся пад моцным ціскам з боку грамадскасці, якая ва ўмовах эканамічнага крызісу выступала за дзяржаўнае рэгуляванне як гарантыю сацыяльнай абароненасці. Афіцыйная федэрацыя прафсаюзаў настойвала на захаванні кантролю за цэнамі на тавары першай неабходнасці [5, арк. 75]. Нават незалежныя прафсаюзы бачылі ў рынкавых механізмах пагрозу матэрыяльнаму становішчу працоўных [5, арк. 20–21].

У 1993 г. працягнулася далейшая лібералізацыя цэн на прадукты харчавання. Кантраляванымі цэны засталіся на абмежаванае кола харчовых тавараў, прычым яны былі істотна павышаныя. Са жніўня 1993 г. паэтапна павялічваліся тарыфы на электраэнергію. Нягледзячы на тое, што ў выніку праводзімай палітыкі доля рэгулюемых цэн у Беларусі знізілася (Малюнак 1), яна ўсе роўна заставалася вельмі істотнай, значана вышэйшай, чым у Расіі і краінах Балтыі [6, с. 44].




*Крыніца: уласная расрацоўка аўтара на асное Transition report, 1999: ten years of transition: economic transition in central and eastern Europe, the Baltic states and the CIS. – London: EBRD, 2000. – С. 196*

Малюнак 1 – Змяненне на працягу 1990–1994 гг. долі рэгулюемых цэн у індэксе спажывецкіх цэнаў (у %)

Такая сітуацыя склалася таму, што, акрамя непасрэднага адміністрацыйнага кантролю, дзяржава знайшла яшчэ адзін спосаб ўплыву на цэны. Значная колькасць прадпрыемстваў былі ўключаны ў рэестр манапалістаў. Згодна з пастановамі Савета Міністраў ад 22.02.1992 № 27 і ад 19.10.1992 г. № 634, цэны на іх прадукцыю рэгуляваліся дзяржавай праз гранічныя і фіксаваныя цэны (тарыфы), лімітавыя каэфіцыенты і гранічныя ўзроўні рэнтабельнасці [7, арк. 30]. Такім чынам, нягледзячы на лібералізацыю, роля дзяржавы ў палітыцы цэнаўтварэння заставалася вырашальнай.

Пасля атрымання незалежнасці пачала фарміравацца рынкавая інфраструктура, у першую чаргу інфраструктура рынка капіталу, важнымі інстытутамі якога з’яўляліся банкі, страхавыя і аўдытарскія кампаніі, фондавая біржа і брокерскія фірмы.

Так, ў рынкавы бок працягнуў свае развіццё банкаўскі сектар Беларусі, дзе ў пачатку 1994 г. працавала 30 камерцыйных банкаўскіх устаноў. У гэтай сферы па-ранейшаму дамінавала дзяржава: асноўную частку аперацый здзяйснялі не чыста прадпрымальніцкія структуры, а паўдзяржаўныя арганізацыі. Такімі былі пяць самых буйных банкаў, якія мелі 80 % усяго ўстаўнога капіталу банкаўскага сектара, у той час, як астатнія банкаўскія ўстановы (заснаваныя пераважна на прадпрымальніцкім капітале) – толькі 20 % [8, арк. 234]. Буйныя Белаграпрамбанк і Белпрамбудбанк забяспечвалі ў 1993 г. 68 % усіх крэдытных рэсурсаў рэспублікі. У галіне валютных аперацый манапалістам заставаўся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Белзнешэканомбанк [9, арк. 17]. Але. нягледзячы на ўсе складанасці, колькасць банкаў павялічвалася, да канца 1994 г. іх налічвалася ўжо 47 [10, с. 18], а сукупны памер іх актываў у студзені 1995 г. складаў каля 1,6 млрд. долараў ЗША [11, с. 36].

Зацікаўленасць ў дзейнасці на фінансавым рынку праяўлялі і небанкаўскія прадпрымальніцкія структуры. Аднак, дзяржава абмяжоўвала іх ролю шляхам патрабавання спецыяльных дазволаў. Нават камерцыйныя банкі не маглі здзяйсняць многія звычайная на міжнародным фінансавым рынку аперацыі, бо Нацыянальны банк вельмі пераборліва падыходзіў да выдачы ліцэнзій.

Важнай падзеяй стала ўвядзенне ў студзені 1993 г. механізма міжбанкаўскіх разлікаў праз адзіны карэспандэнцкі рахунак, які фактычна стварыў безнаяўную валюту. А 4 сакавіка 1993 г. васямнаццаць беларускіх банкаў заснавалі «Міжбанкаўскую валютную біржу». Асноўнай мэтай яе стварэння з'яўлялася арганізацыя рынкавага механізму каціроўкі нацыянальнай грашовай адзінкі. Праз 20 дзён на біржы адбылася першая гандлёвая сесія, па выніках якой на рынкавай аснове быў усталяваны афіцыйны курс безнаяўнага беларускага рубля.

«Фарміраванне курса праз валютны рынак – гэта адзіны правільны шлях…. мы двойчы спрабавалі стварыць нейкае адміністрацыйнае рэгуляванне (*аўт. – курса*), нічога не атрымоўваецца», – паведамляў тагачасны віцэ-прэм'ер М. Мясніковіч [12, арк. 98]. Трэба адзначыць, што першапачаткова ўрад займаў супрацьлеглую пазіцыю і лічыў, што хуткае ўвядзенне рынкавага курсу можа ўдарыць па дзяржаўных прадпрыемствах, якія набывалі сыравіну па дзяржаўных цэнах, а прадавалі тавары па штучна завышаных рынкавых. У сваю чаргу Нацыянальны банк звяртаў увагу на тое, што прымяненне ільготных курсаў ўяўляе сабой неэфектыўнае датаванне, толькі ў схаванай форме, і ад яго трэба адмаўляцца [13, арк. 45].

Увогуле характэрнай рысай тых часоў было існаванне мноства валютных курсаў. З сакавіка 1992 г. іх ў Беларусі існавала чатыры, у 1993 г. заставалася два, і нарэшце толькі з 1994 г. быў усталяваны адзіны рынкавы [14, с. 9]. У выніку такой курсавой палітыкі пачаўся росквіт бізнесу вулічных валютчыкаў. Але больш за ўсё праблем склалася ў знешнім гандлі. Мноства курсаў і адміністрацыйнае іх фарміраванне тармазілі айчынны экспарт. Курс беларускага рубля ўяўляўся экспарцёрам дыскрымінацыйнай мерай, якая ставіла іх ў вельмі складаныя ўмовы [15, арк. 49, 53].

Акрамя таго, свабодная канвертацыя валюты была абмежавана ўмовай абавязковай продажы часткі валютнай выручкі дзяржаве. Гэта было важнай мерай кантролю за сродкамі, якія павінны былі паступаць у краіну, і асноўнай крыніцай папаўнення валютных рэзерваў.

У першыя гады незалежнасці сваё развіццё таксама атрымаў рынак страхавых паслуг. У пачатку 1995 г. у Беларусі налічвалася каля 70 страхавых кампаній з арыенціровачным гадавым прыбыткам у памеры 6 млн. долараў ЗША. Але, як і ў банкаўскім сектары, тут таксама значную вагу мела дзяржава, бо ёй належыла прыблізна трэцяя частка ўсіх страхавых кампаній [11, с. 36].

У першай палове 1990-ых гг. фарміруецца інфраструктура фондавага рынку – яшчэ аднаго важнага элемента рынку капітала. У 1992 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб каштоўных паперах і фондавых біржах», які прыйшоў на змену палажэнню ад 1990 г. «Аб каштоўных паперах». Закон вызначыў адзіны парадак выпуску і звароту каштоўных папер, рэгулявання дзейнасці прафесійных удзельнікаў гэтага рынку, а таксама прынцыпы арганізацыі працы фондавай біржы. Прыняты прававы акт усталёўваў патрабаванні да асоб, якія ажыццяўлялі прафесійную дзейнасць звязаную з абарачэннем каштоўных папер, стварыў ўмовы для арганізацыі ў рэспубліцы адпаведных структур.

У выніку рэалізацыі закона ў 1993 г. была створана Беларуская фондавая біржа і яе філіялы ў буйных гарадах краіны. Ужо да пачатку 1994 г. спецыялізаванай дзяржаўнай інспекцыяй была зарэгістравана эмісія каштоўных папер 352 акцыянерных таварыстваў на агульную суму 268,7 млрд. рублёў, выдадзены ліцэнзіі на права займацца прафесійнай брокерскай дзейнасцю 60 юрыдычным асобам, атэставана больш за 260 супрацоўнікаў прафесійных удзельнікаў фондавага рынку [16, арк. 38]. У 1994 г. Міністэрства фінансаў эмітавала першы выпуск дзяржаўных кароткатэрміновых аблігацый, заклаўшы аснову для станаўлення ў рэспубліцы рынку дзяржаўных каштоўных папер.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Нягледзячы на прагрэсіўныя зрухі, фондавы рынак Беларусі заставаўся неразвітым. На біржы гандлявалі толькі некалькі дзясяткаў кампаній, у асноўным банкаўскія установы. Дадзеная сітуацыя была абумоўлена высокімі тэмпамі інфляцыі, рознымі дзяржаўнымі абмежаваннямі і сур'ёзным адставаннем аб'ёмаў крэдытавання і бюджэтнага фінансавання ад росту цэнаў.

Таксама адмоўна на развіццё фондавага рынку ўплывалі адсутнасць неабходнай інфраструктуры, нізкая ліквіднасць каштоўных папер, адсутнасць на другасным рынку масавага эмітэнта – дзяржавы, якой належыла 90 % уласнасці, абмежаваная колькасць каштоўных папер, гандаль нетрадыцыйнымі для фондавых біржаў каштоўнасцямі – напрыклад, даўгавымі абавязацельствамі прадпрыемстваў Расіі [8, арк. 237–238].

У першай палове 1990-ых гг. складваецца рынак сродкаў вытворчасці, формамі арганізацыі якога з'яўляліся таварныя і сыравінныя біржы, гандлёва пасярэдніцкія арганізацыі.

Гандаль, дзе раней тавары размяркоўваліся праз дзяржаўную аптовую сетку, хутка рэарганізоўваўся на рынкавай аснове. Была абмежаваная роля дзяржавы ў асобе галіновага міністэрства. У першай палове 1992 г. гандлёвым арганізацыям было прадстаўлена права юрыдычнай асобы, надавалася свабода выбару парадку тавазабеспячэння, шляхам пашырэння непасрэдных сувязяў па пастаўках, абыходзячы аптовыя сеткі. Адбывалася дэманапалізацыя. У канцы 1993 – пачатку 1994 г. былі адмененыя ліміты на гандлёвыя надбаўкі, што дало магчымасць скараціць не толькі іх агульны аб'ём, але і колькасць пасярэднікаў пры руху тавараў ад пастаўшчыка да спажыўца [6, с. 53].

Расла колькасць таварных біржаў, яны аб'ядноўваліся ў больш буйныя (самымі значнымі былі: біржа «Белая Русь», «Мінская біржа», Беларуская біржа таваравытворцаў). Аднак большасць устаноў, якія называліся біржамі, такімі не з'яўляліся. Яны, збольшага, уяўлялі сабой пераходны тып паміж кірмашом, буйнааптовым гандлёвым домам і ўласна біржай.

У пачатку 1992 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб таварных біржах», які вызначаў прававыя, эканамічныя і арганізацыйныя асновы іх дзейнасці, быў скіраваны на развіццё працы па фарміраванні аптовага рынку тавараў на аснове свабоднага цэнаўтварэння і канкурэнцыі. Але функцыянаванне таварных біржаў, якія спачатку бурліва развіваліся, паступова прыходзіла да крызіснага стану.

У развіцці біржавага гандлю назіраліся пэўныя абмежаванні. Тавары, прададзеныя на біржы, не маглі вывозіцца без ліцэнзіі. Уведзеная сістэма падаткаў таксама аслабляла біржавую і брокерскую дзейнасць, якая была прыраўняная да звычайнай куплі-продажы. У 1993 г. у Беларусі дзейнічала 13 біржаў з абаротам 60,4 млрд. рублёў, але ў 1994 г. іх колькасць скарацілася да 10, а абарот паменшыўся да 34,3 млрд. рублёў. Скарацілася колькасць кантрактаў па продажы (з 6,7 да 2,7 тысяч), як і колькасць брокерскіх кантор і незалежных брокераў (з 2,6 тысяч да 1,5 тысяч) [17, с. 120].

Як адзначаў старшыня саюза прадпрымальнікаў У.Карагін, адносіны да біржавых структур «па меншай меры недальнабачныя. Яны вядуць да далейшага пагаршэння крызіснай сітуацыі ў эканоміцы» [18, с. 1]. Сярод складанасцяў, якія напаткалі біржавы гандаль, варта адзначыць такія фактары як марудныя разлікі паміж брокерскімі канторамі, адсутнасць гарантый трываласці дамоў, складанасці з экспартам тавараў. Прадпрымальнікі больш працавалі на пазабіржавым рынку. З усіх біржаў дастаткова ўстойлівае становішча мела толькі Белаграпрамбіржа, што было абумоўлена профілем яе дзейнасці (сельскагаспадарчая прадукцыя мае ўстойлівы попыт) [8, арк. 234].

У знешнім гандлі да 1994 г. працягвалася практыка заключэння міжрэспубліканскіх дагавораў на пастаўкі тавараў. Пэўны час знешнегандлёвыя аперацыі з краінамі СНД здзяйсняліся на аснове клірынгу (сістэмы безнаяўных разлікаў, заснаванай на заліку ўзаемных абавязкаў і патрабаванняў), што вылівалася ў продаж за мяжу прадукцыі па заніжаных цэнах. Галоўным бар'ерам для развіцця гандлю на рынкавых пачатках было рэгуляванне экспарту па ўласным меркаванні дзяржавы. У кастрычніку 1992 г. была ўведзена дзяржаўная манаполія знешнегандлёвай дзейнасці. Экспарцёры павінны былі прадаваць сваю прадукцыю праз адзіную дзяржаўную арганізацыю па цэнах значна ніжэйшых за сусветныя. Экспарт і імпарт тавараў патрабавалі атрымання ліцэнзій і квот. На некаторыя віды тавараў у 1992 г. (напрыклад, зерне ці скураную і шубна-футравую сыравіну) для камерцыйных структур увогуле была ўведзена забарона на вываз за межы рэспублікі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзяржава прыкладала намаганні па лібералізацыі гандлю, ў першую чаргу з галоўным знешнеэканамічным партнёрам – Расіяй, на якую прыходзілася большая частка ўсяго экспарту. Беларуская эканоміка вырабляла неканкурэнтаздольныя тавары для знешніх рынкаў. У той жа час захаванне нізкіх цэн на матэрыялы і сыравіну з Расіі дазвалялі беларускім вытворцам пастаўляць туды сваю прадукцыю, якая карысталася ўстойлівым попытам. Згодна з дамовай аб стварэнні адзінай рублёвай зоны, Беларусь узяла абавязак прывесці ўсе мытныя падаткі і зборы ў адпаведнасць з расійскімі, ва ўзаемным гандлі ліквідаваць тарыфныя абмежаванні, адмяніць ўсе квоты і ліцэнзіі. 30 красавіка 1994 г. з усходняй суседкай было падпісана пагадненне аб уніфікацыі мытных пошлін і адмене розных абмежаванняў, што было важным крокам па лібералізацыі гандлёвай дзейнасці з галоўным знешнеэканамічным партнёрам [19, арк. 12].

Прэм'ер В. Кебіч разумеў, што рост цэнаў на расійскія энергарэсурсы ператворыць паспяховую рэспубліку ў банкрута. Таму ў красавіку 1992 г. у прамысловасці быў узяты курс на скарачэнне энергаёмістых вытворчасцей. Для павышэння эфектыўнасці выкарыстання нафты прадугледжвалася будаўніцтва комплексаў яе глыбокай перапрацоўкі на айчынных нафтаперапрацоўчых заводах. Таксама было прынята рашэнне напраўляць дзяржаўныя інвестыцыі ў першую чаргу ў галіны, якія даюць хуткую аддачу – сельскую гаспадарку і вытворчасць тавараў народнага спажывання. Але захады ўрада хутчэй былі накіраваны на вырашэнне бягучых гаспадарчых задач, чым на хуткую структурную перабудову эканомікі ў рынкавы бок.

Ва ўмовах крызісу дзяржава вымушана была прымаць меры па рэфармаванні падатковай сістэмы, якая першыя гады незалежнасці функцыянавала даволі дрэнна, у чым прызнаваліся самі ўлады [20, с. 2]. У 1992 г. замест падатку з абароту быў уведзены характэрны для рынкавай эканомікі падатак на дабаўлены кошт, а ў пачатку 1994 г. у межах мерапрыемстваў па выхаду з крызіснай сітуацыі былі паменшаны стаўкі большасці падатковых тарыфаў, ўведзены ільготы для малога бізнэсу, вытворцаў, што, безумоўна, было добрым сігналам для развіцця рынкавых інстытутаў [3, арк. 10–11].

Важнай падзеяй ў развіцці рынкавых адносін стала прыняцце ў 1991 г. закона «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве». Аднак, гэты закон шмат у чым насіў дэкларатыўны характар. Афіцыйнае ўкараненне паўнавартаснага інстытута банкруцтва ў Рэспубліцы Беларусь пачалося амаль на дзесяцігоддзе пазней. Паводле ацэнак Міністэрства эканомікі, у пачатку 1995 г. каля 600 прадпрыемстваў з'яўляліся неплацежаздольнымі, але да іх усё роўна не прымянялася працэдура банкруцтва [11, с. 36].

У канцы 1992 г. быў прыняты важны рынкавы закон «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», які вызначыў асновы абмежавання, спынення і папярэджання манапалістычнай дзейнасці і быў накіраваны на стварэнне ўмоў для развіцця канкурэнцыі ў мэтах эфектыўнага функцыянавання таварных рынкаў і абароны правоў спажыўцоў. Нягледзячы на ўзяты курс на дэманапалізацыю (у 1992 г. быў нават створаны антыманапольны камітэт), улады ўсё ж не імкнуліся да хуткіх пераўтварэнняў у гэтым напрамку. Хутчэй наадварот, дзяржава фарміравала галіновыя манаполіі – канцэрны, а канкурэнцыю спрабавала замяніць інструментамі адміністрацыйнага кантролю. Даручэнні ўрада часта ўтрымлівалі меры, якія былі накіраваны на рэфармаванне эканомікі хутчэй праз ўзмацненне рэгулюючай ролі дзяржавы [13, арк. 31].

Такім чынам, у 1991–1994 гг. у рэспубліцы назіраўся працэс фарміравання асноўных элементаў рынкавай інфраструктуры, якая павінна была забяспечыць эфектыўную дзейнасць эканомікі. У гэты час адбывалася ўтварэнне інфраструктуры рынку капіталу. Працягнуў сваё развіццё банкаўскі сектар, які пашырыўся, набыў новыя рысы ва ўмовах ажыццяўлення самастойнай фінансавай палітыкі. У гэты ж перыяд нараджаецца айчынны фондавы рынак, разгарнуўся рынак сродкаў вытворчасці, ў працэсе станаўлення якога ключавую ролю адыгрывала дзейнасць таварных біржаў, развіццё гандлёвых адносін на рынкавай аснове. Цэнавая палітыка стала больш ліберальнай, урад працягнуў курс па дэманапалізацыі айчыннай эканомікі.

Аднак, у гэты ж перыяд тэмпы рэфармавання выразна замарудзіліся. У банкаўскай сферы, як і ў эканоміцы ў цэлым, па-ранейшаму значную ролю мела дзяржава, замест

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пашырэння канкурэнцыі нярэдка назіралася захаванне манапалістычных тэндэнцый. Многія рынкавыя інстытуты, якія паспелі ўзнікнуць падчас рэформ, знаходзіліся ў крызісным стане. Напрыклад, тармазілася развіццё рынкавага тавараабмену, вузкія формы набыў айчынны рынак каштоўных папер. У большасці фарміраванне рынкавай інфраструктуры ішло стыхійна і не заўсёды эфектыўна. У гэты перыяд Беларусь выразна пачала адставаць па тэмпах рэфармавання айчыннай эканомікі ад шэрагу краін усходнееўрапейскага рэгіёна.

## Літаратура


1. В период перестройки: смутные времена торговли. Вспоминает Владимир Демьянович – министр торговли Республики Беларусь в 1990–1991 годы // Гермес: журнал министерства торговли Республики Беларусь. – 2011. – № 7. – С. 52–57.
2. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 615.
3. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 1047.
4. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 12. – Спр. 128.
5. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 1159.
6. Мясникович, М.В. Становление рыночной экономики в Республике Беларусь / М.В. Мясникович. – Мн. : БГЭУ «Мисанта», 1995. – 112 с.
7. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 12. – Спр. 121.
8. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 1162.
9. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 639.
10. Финансы Республики Беларусь в 1991–1994 гг.: статистический сборник. – Минск : Минстат РБ, 1996 – 74 с.
11. Transition report, 1995: investment and enterprise development: economic transition in Eastern Europe and the former Soviet Union. – London : EBRD, 1995 – 223 c.
12. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 4135.
13. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 603.
14. Курсы Национального банка Республики Беларусь и Центрального банка Российской Федерации, 1990–1997 гг. : Ежегод. справ. альм. / Гл. ред. В.М. Гревцов. – Минск : ООО «Агентство Владимира Гревцова», 1998. – Вып. 1. – 277 с.
15. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 3048.
16. НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 12. – Спр. 1157.
17. Народное хозяйство Республики Беларусь, 1994 год: статистический ежегодник // Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. – Минск, 1995 – 543 с.
18. Предприниматели возмущены парламентом и братаются с правительством // Белорусский рынок. – 1992. – № 6. – С. 1.
19. НАРБ. – Ф. 968. – Воп. 1. – Спр. 4141.
20. Бизнес и правительство: разговор напрямую // Деловой вестник. – 1992. – № 2. – С. 2.


Белорусский государственный университет

Поступила в редакцию 05.10.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ